# Палітычная праграма
# Руху «За Свабоду»

Мінск, 2018

# Уступ

Сёння Беларусь знаходзіцца ў складаных унутраных і знешніх варунках: у краіне адсутнічае дэмакратыя і свабодныя выбары, ёсць вялікая палітычная і эканамічная залежнасць ад Расіі, якая пагражае суверэнітэту, дыялог з Захадам нетрывалы і не набыў стратэгічнага значэння.

Палітычная праграма Руху «За Свабоду» - гэта бачанне арганізацыяй таго, якія рэформы неабходныя краіне, як дзяржава павінна рэагаваць на выклікі і пагрозы, наша разуменне новай Беларусі.

## Восем асноўных тэмаў праграмы

**Парламенцка-прэзідэнцкая рэспубліка.** Народ выбірае ўладу знізу даверху. Мы выступаем за прыняццё новай Канстытуцыі, якая замацуе парламенцка-прэзідэнцкую форму кіравання ў Беларусі і адновіць рэальны падзел уладаў, самастойнасць і незалежнасць заканадаўчага органа, эфектыўны парламенцкі кантроль за дзейнасцю ўрада, аўтаномнае мясцовае самакіраванне.

**Стварэнне мясцовага самакіравання замест «прэзідэнцкай вертыкалі ўлады».** Аўтаномнае мясцовае самакіраванне і замена «прэзідэнцкай вертыкалі ўлады» выбарнасцю кіраўнікоў мясцовых органаў улады ў адпаведнасці з прынцыпамі Еўрапейскай хартыі аб мясцовым самакіраванні.

**Судовая рэформа:** справядлівасць правасуддзя праз незалежнасць судовай сістэмы. У Беларусі павінна быць створаная судовая сістэма,

вольная ад палітычнага ціску, корпус суддзяў мусіць быць кампетэнтным, карыстацца поўным даверам грамадзян, прысуды павінны быць матываванымі, абгрунтаванымі, законнымі і справядлівымі.

**Новая сістэма нацыянальнай бяспекі:** войска пад грамадскім кантролем і з апорай на беларускую гісторыю. Беларусь мусіць зрабіцца сапраўды нейтральнай краінай у ваенным плане, што патрабуе выхаду з вайсковага блоку АДКБ і вываду замежных вайсковых аб’ектаў з тэрыторыі краіны.

**Шлях Беларусі да еўраатлантычнай супольнасці.** Стратэгічнай мэтай з’яўляецца ператварэнне краіны ў рэальнага суб’екта міжнародных адносін, адносіны з усімі міжнароднымі арганізацыямі і краінамі мусяць будавацца выключна на падставах мэтазгоднасці і адпаведнасці нацыянальным інтарэсам.

**Пераход ад перажыткаў каманднай эканомікі да вольнага рынка.** У Беларусі павінна прайсці лібералізацыя ўсіх рынкаў, быць створаныя інстытуты адкрытай рынкавай эканомікі, адноўленае права прыватнай уласнасці на зямлю, дзяржава мусіць устанаўліваць і потым падтрымліваць правілы гульні для суб’ектаў гаспадарання, а не канкурыраваць з імі.

**Якасная медыцына з чалавечым абліччам.** Фінансаванне медыцынскай галіны павінна быць палепшанае праз праз прыцягненне дадатковых сродкаў і аптымізацыі выдаткаў, сістэма аховы здароўя Беларусі мусіць перайсці да страхавой мадэлі, за аснову лячэння павінны быць узятыя еўрапейскія пратаколы і стандарты.

**Новая сістэма адукацыі для еўрапейскай будучыні.** Сістэма адукацыі павінна рыхтаваць навучэнцаў не да здачы іспытаў, а да жыцця, замест абавязковага размеркавання выпускнікоў павінна быць дапамога з боку ВНУ сваім выпускнікам знайсці першае месца працы, установы адукацыі павінны зрабіцца нацыянальнымі і пры гэтым уключанымі ў Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі, гэта значыць, удзельнічаць у Балонскім працэсе.

Праграма падрыхтаваная экспертамі і прайшла шматузроўневае абмеркаванне ўнутры арганізацыі.

У падрыхтоўцы дакумента ўдзельнічалі доктар юрыдычных навук Міхаіл Пастухоў, палітолаг-міжнароднік Андрэй Фёдараў, культуролаг і магістр кіравання Вадзім Мажэйка, медык, кандыдат навук Андрэй Вітушка, магістр Андрэй Клікуноў, аналітык BSB Blog Зміцер Міцкевіч, кандыдат эканамічных навук Людміла Гразнова, а таксама сябры Руху «За Свабоду», якія выказваліся і каментавалі.

# Парламенцка-прэзідэнцкая рэспубліка,

## народ выбірае ўладу знізу даверху

*• Прыняцце новай Канстытуцыі, якая замацуе парламенцка-прэзідэнцкую форму кіравання ў Беларусі: прэзідэнт, як намінальны кіраўнік дзяржавы, будзе выконваць пераважна прадстаўнічыя функцыі, а «моцны» прэм’ер-міністр будзе абапірацца на парламенцкую большасць і з’яўляцца рэальным кіраўніком выканаўчай галіны ўлады.*

*• Аднаўленне рэальнага падзелу ўладаў; самастойнасці і незалежнасці сістэмы судоў, заканадаўчага органа; эфектыўны парламенцкі кантроль за дзейнасцю ўрада; аўтаномнае мясцовае самакіраванне і замена «прэзідэнцкай вертыкалі» выбарнасцю кіраўнікоў мясцовых органаў улады.*

### Праблемы

• пасада прэзідэнта ўвыраддзілася ў аднаасобную ўладу кіраўніка дзяржавы;

• скасаваны прынцып падзелу ўладаў;

• усталяваны прынцып вяршэнства прэзідэнцкіх актаў («У выпадку разыходжання дэкрэта або ўказа з законам закон мае вяршэнства толькі тады, калі паўнамоцтвы на выданне дэкрэта або ўказа былі прадастаўлены законам»);

• адсутнічаюць механізмы кантролю і стрымак ў дачыненні да кіраўніка дзяржавы;

• цяперашні двухпалатны парламент (Нацыянальны сход) з’яўляецца дэкаратыўным органам, які не выконвае сваіх функцый;

• дэпутаты Палаты прадстаўнікоў не з’яўляюцца заканадаўцамі, не ўдзельнічаюць у фарміраванні парадку дня сесіі, не маюць ўплыву на іншыя органы ўлады;

• адсутнасць самастойнага статусу ў дзейнага ўрада і яго поўная залежнасць ад кіраўніка дзяржавы;

• нізкі прафесійны ўзровень членаў урада і іх безініцыятыўнасць у прыняцці рашэнняў;

• адсутнасць кантролю за ўрадам з боку дэпутатаў парламента, грамадскасці, грамадзян;

• грувасткасць сістэмы агульнанацыянальных органаў дзяржаўнага кіравання і іх залежнасць ад прэзідэнта і створаных пры ім структур;

• поўная залежнасць судоў і суддзяў ад прэзідэнта і яго структур;

• абвінаваўчая і палітычная накіраванасць у дзейнасці суддзяў;

• непрафесіяналізм і прадузятасць суддзяў пры разглядзе спраў;

• немагчымасць абароны у крымінальным і адміністрацыйным судаводстве правоў падазраваных / абвінавачаных, нікчэмная роля адваката-абаронцы ў працэсе;

• няўдзел у ажыццяўленні правасуддзя прадстаўнікоў ад грамадзянскай супольнасці (у тым ліку ў форме прысяжных засядацеляў);

• адмовы судоў у разглядзе скаргаў на рашэнні і дзеянні органаў кіравання і службовых асоб, якія парушаюць правы і свабоды грамадзян;

• у Беларусі дэ-факта адсутнічае мясцовае самакіраванне.

## Стратэгічныя кірункі вырашэння

• Вярнуць легітымнасць пасадзе прэзідэнта і забяспечыць дзеянне сістэмы стрымак і процівагаў;

• Унесці змены ў Канстытуцыю і зрабіць парламент рэальным органам народнага прадстаўніцтва, які з дапамогай дэпутатаў рыхтуе патрэбныя для развіцця краіны законы, кантралюе дзейнасць ўсіх органаў улады, ад імя парламенцкай большасці фарміруе ўрад.

• Самастойнасць і незалежнасць сістэмы судоў замацоўваецца праз абранне суддзяў на нацыянальным узроўні парламентам, на мясцовым – мясцовымі прадстаўнічымі органамі па рэкамендацыі Усебеларускай рады суддзяў з ліку кандыдатаў, якія здалі кваліфікацыйны экзамен, пад

час якога адбываецца праверка дзейнасці кандыдата за мінулы перыяд.

• Аднавіць самастойнасць мясцовага самакіравання шляхам правядзення дэмакратычных выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў і падпарадкавання ім выканаўчых органаў уключна з кіраўнікамі выканкамаў.

• Перагледзець асноўныя заканадаўчыя акты на прадмет адпаведнасці абноўленай Канстытуцыі і міжнародным (еўрапейскім) стандартам.

• Прыняць у якасці асноўнай крыніцы новага заканадаўства Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

• Падрыхтаваць і прыняць Праграму асноўных напрамкаў развіцця заканадаўства Рэспублікі Беларусь на бліжэйшую перспектыву.

• Увесці мараторый на прымяненне смяротнага пакарання з далейшай яго адменай.

## Першакрокавыя меры

• Самаабмежаваць паўнамоцтвы прэзідэнта ў рамках Канстытуцыі узору 1996 г.

• Унясенне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю ўзору 1996 г. у мэтах трансфармацыі моцнай прэзідэнцкай улады (прыняцце «малой Канстытуцыі») у кірунку парламенцка-прэзідэнцкай формы кіравання ў Беларусі.

• Выбары парламента з новымі больш шырокімі паўнамоцтвамі па змешанай мажарытарна-прапарцыйнай сістэме.

• Парламенцкая большасць утварае партыйную кааліцыю, якая вылучае прэм’ер-міністра і прапануе пасады ў кабінеце міністраў; кандыдатуры атрымліваюць падтрымку парламента і ўхваляюцца або адхіляюцца прэзідэнтам.

• Утварэнне аўтаномнай і самакіравальнай Усебеларускай рады суддзяў.

• Замацаванне ў Канстытуцыі прынцыпу выбарнасці суддзяў на нацыянальным узроўні парламентам, на мясцовым – мясцовымі прадстаўнічымі органамі.

• Падрыхтоўка і прыняцце Канцэпцыі судова-прававой рэформы і ў яе развіццё Закона аб судаўладкаванні Рэспублікі Беларусь.

• Падрыхтоўка і прыняццё Канцэпцыю стварэння мясцовага самакіравання ў Беларусі і ў развіццё закона аб мясцовым самакіраванні.

• Правядзенне дэмакратычных выбараў ў мясцовыя прадстаўнічыя органы.

• Сфармаваць новыя выканаўчыя органы шляхам зацвярджэння іх складу на сесіях адпаведных прадстаўнічых органаў.

• Унесці змены і дапаўненні ў заканадаўства аб дзяржслужбе, якія прадугледжваюць адкрыты конкурс на займанне пасадаў дзяржслужачых і мінімізуюць кантакты грамадзян з бюракратычнай сістэмай.

## Вынікі

• У Беларусі аднаўляецца канстытуцыйная законнасць і рэальны падзел уладаў. Грамадзяне на сапраўдных канкурэнтных выбарах абіраюць сваіх прадстаўнікоў у заканадаўчы і прадстаўнічыя органы па змешанай мажарытарна-прапарцыйнай сістэме.

• Прэзідэнт з’яўляецца намінальным кіраўніком дзяржавы, у асноўным выконвае прадстаўнічыя функцыі.

• Урад знаходзіцца пад эфектыўным парламенцкім кантролем, але з’яўляецца аўтаномным у межах сваёй кампетэнцыі, дзейнічае ў інтарэсах усяго насельніцтва Беларусі.

• Незалежная судовая сістэма вольная ад палітычнага ціску з боку выканаўчай або заканадаўчай улады. Яна з’яўляецца самастойнай, незалежнай і кампетэнтнай, карыстаецца поўным даверам грамадзян.

• Мясцовае самакіраванне сфармавана паводле прынцыпаў адпаведнай Еўрапейскай хартыі, з’яўляецца аўтаномным у межах сваёй кампетэнцыі, дзейнічае ў інтарэсах мясцовага насельніцтва. Насельніцтва абірае кіраўнікоў мясцовых органаў улады.

• У Беларусі прынята новае заканадаўства ў адпаведнасці з міжнароднымі (еўрапейскімі) стандартамі. Краіна ўступіла ў Раду Еўропы, яе грамадзяне атрымалі доступ да Еўрапейскага суда па правах чалавека і забяспечылі высокі ўзровень абароны сваіх правоў.

• У Беларусі скарочаная колькасць чыноўнікаў і былі мінімізаваныя кантакты грамадзян з бюракратычнай сістэмай.

# **Мясцовае самакіраванне** замест «прэзідэнцкай вертыкалі ўлады»

*• Аўтаномнае мясцовае самакіраванне і замена «прэзідэнцкай вертыкалі ўлады» выбарнасцю кіраўнікоў мясцовых органаў улады ў адпаведнасці з прынцыпамі Еўрапейскай хартыі аб мясцовым самакіраванні.*

*• Структурныя змены ўключаюць у сябе дакладны падзел паміж мясцовым самакіраваннем і дзяржаўным кіраваннем.*

*• Стварэнне выканаўчых органаў мясцовых Саветаў усіх населеных пунктаў Беларусі і ўвядзенне пасады старшыні савета (старасты на ўзроўні сёлаў, мэра на ўзроўні гарадоў і мястэчак), якога абіраюць з ліку дэпутатаў адпаведнага савета (Рады).*

*• Паўнамоцтвы мясцовых Саветаў (Радаў), іх выканаўчых органаў і старшыняў саветаў (старастаў на ўзроўні сёлаў, мэраў на ўзроўні гарадоў і мястэчак) маюць уключаць сярод іншага зацвярджэнне і выкананне праграм эканамічнага і сацыяльнага развіцця на мясцовым узроўні, мясцовага бюджэту, усталяваных у межах закона мясцовых падаткаў і збораў, вызначэнне парадку і ажыццяўлення кіравання і распараджэння аб’ектамі камунальнай уласнасці, а таксама правядзенне мясцовых рэферэндумаў.*

## Праблемы

У Беларусі дэ-факта адсутнічае мясцовае самакіраванне. У выніку канстытуцыйнага рэферэндуму 1996 года і ў адпаведнасці з Законам аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь, прынятым у 2009 годзе:

мясцовыя грамады фактычна не маюць магчымасці непасрэдна або праз сваіх прадстаўнікоў у выбарных органах самастойна вырашаць сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя пытанні мясцовага значэння;

мясцовыя грамады фактычна не маюць магчымасці планаваць, ўплываць і кантраляваць развіццё сваіх адміністрацыйна-тэрыярыяльных адзінак, а таксама кантраляваць і ўплываць на накіраванне мясцовых фінансаў на патрэбы мясцовай супольнасці;

выканаўчыя органы адсутнічаюць у сістэме мясцовага самакіравання ў Беларусі, акрамя першаснага ўзроўню, на якім з’яўляюцца непадкантрольнымі ані мясцовай грамадзе, ані адпаведнаму прадстаўнічаму органу мясцовага самакіравання;

непадкантрольнае і непадсправаздачнае мясцовай грамадзе іерархічнае мясцовае дзяржаўнае кіраванне (“вертыкаль”) пранізвае ўсю адміністрацыйна-тэрытарыяльную сістэму Беларусі.

## Стратэгічныя кірункі вырашэння

• Вярнуць паўнавартасны інстытут мясцовага самакіравання ў Беларусі праз прывядзенне закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з артыкулам 117 Канстытуцыі Беларусі. У артыкуле сцвярджаецца наступнае: «Мясцовае самакіраванне ажыццяўляецца грамадзянамі праз мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, органы тэрытарыяльнага грамадскага ўпраўлення, мясцовыя рэферэндумы, сходы і іншыя формы прамога ўдзелу ў дзяржаўных і грамадскіх справах».

• Аднавіць самастойнасць мясцовага самакіравання шляхам правядзення дэмакратычных выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў і падпарадкавання ім выканаўчых органаў, уключна з кіраўнікамі выканкамаў.

• Павінна быць знішчаная іерархія прадстаўнічых органаў улады як рудымент савецкай эпохі падзелу ўлады на месцах.

• Усе структурна-функцыянальныя змены арганізацыйна-прававых асноваў мясцовага самакіравання маюць фінансава забяспечвацца ў заканадаўчым парадку шляхам пакідання прапарцыйна большай долі агульнана-

цыянальных падаткаў, а таксама поўнага аб’ёму мясцовых падаткаў для патрэбаў мясцовага самакіравання.

Для эфектыўнага функцыянавання структура мясцовага самакіравання мае быць простай і не ўваходзіць у ніякія іерархіі. Органы і адказныя асобы мясцовага самакіравання маюць дакладна разумець сферу сваіх паўнамоцтваў падчас прыняцця кіраўнічых рашэнняў і адчуваць адказнасць за іх прынццце перад мясцовай грамадой і дзяржавай. Дзеля гэтага мэтазгодна ўкараніць дакладныя механізмы кантролю законнасці і эфектыўнасці прынятых рашэнняў органаў і адказных асобаў мясцовага самакіравання.

З боку мясцовай грамады законнасць прынятых рашэнняў мае правярацца пры пасярэдніцтве добраахвотных згуртаванняў жыхароў сяла / мястэчка / горада (раёна), у якія маюць уваходзіць прадстаўнікі розных палітычных партыяў і грамадскіх аб’яднанняў, размешчаных на тэрыторыі адпаведнага населенага пункта і раёна. З боку дзяржавы адпаведнасць закону мае правярацца пракуратурай і падаткавай адміністрацыяй.

Наступствам праверак можа быць зварот у суд з наступным скасаваннем рашэння і магчымым прыцягненнем адказныя асобы ці органу мясцовага самакіравання да адказнасці, калі гэтая рашэнне спрычыніла страты. Эфектыўнасць прынятых рашэнняў і нададзеных паслуг мае правярацца незалежнымі аўдытарскімі канторамі.

## Першакрокавыя меры

1. Абскардзіць у Канстытуцыйным судзе Беларусі неадпаведнасці палажэнняў Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі Беларусі (арт.117, гл. вышэй).

2. Падрыхтаваць і прыняць Канцэпцыю стварэння мясцовага самакіравання ў Беларусі і ў развіццё закон «Аб мясцовым самакіраванні». Азначаная канцэпцыя абавязкова павінна ўлічваць рэкамендацыі Еўрапейскай Хартыі аб мясцовым самакіраванні 1985 г. і мадэльнага Закона дзяржаў-удзельніц СНД 1998 г. «Аб агульных прынцыпах арганізацыі мясцовага самакіравання». Канцэпцыя павінна суправаджацца пакетам законапраектаў, якія ствараюць шырокую нарматыўна-прававую базу ў сферы дзейнасці мясцовых органаў улады.

3. Падрыхтаваць і пралабіяваць закон «Аб мясцовым самакіраванні і кіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», распрацаваны ў адпаведнасці з Канцэпцыяй рэфармавання мясцовай улады ў Беларусі.

4. Правесці дэмакратычныя выбары ў мясцовыя прадстаўнічыя органы з шырокімназіраннем з боку мясцовых грамадаў.

5. Сфармаваць новыя выканаўчыя органы мясцовага самакіравання адпаведнымі мясцовымі прадстаўнічымі органамі.

## Вынікі

• Мясцовае самакіраванне сфармавана паводле прынцыпаў адпаведнай Еўрапейскай хартыі, з’яўляецца аўтаномным у межах сваёй кампетэнцыі, дзейнічае ў інтарэсах мясцовага насельніцтва. Насельніцтва абірае кіраўнікоў мясцовых органаў улады.

• Мясцовая грамада – суб’ект мясцовага самакіравання, які самастойна або праз прадстаўнікоў у выбарных органах вырашае сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя пытанні мясцовага значэння.

• Адсутнічае падзел населеных пунктаў паводле падпарадкавання ці значэння стасоўна сістэмы мясцовага самакіравання.

• Прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання з’яўляюцца падсправаздачнымі і падкантрольнымі мясцовай грамадзе, не ўваходзяць у ніякія іерархіі.

• Выканаўчыя органы мясцовага самакіравання з’яўляюцццa падсправаздачнымі і падкантрольнымі адпаведным прадстаўнічым органам мясцовага самакіравання, якія яны фарміруюць, а таксама мясцовай грамадзе;

• дзяржаўныя органы на ўзроўні субпрэфектураў (раёны і гарады абласнога падпарадкавання) і прэфектураў (г. Мінск і абласны узровень) фарміруюцца абласным і цэнтральным урадам адпаведна і маюць вычарпальны пералік абавязкаў, з’яўляюцца падсправаздачнымі і падкантрольнымі адпаведным рэгіянальным выканаўчым уладам Беларусі і адпаведным міністэрствам і ведамствам.

# Справядлівасць правасуддзя
## праз незалежнасць судовай сістэмы

*• Стварэнне ў Беларусі незалежнай судовай сістэмы, вольнай ад палітычнага ціску з боку выканаўчай або заканадаўчай улады. Судовая ўлада -- асноўны гарант правоў і свабодаў грамадзян і іншых удзельнікаў праваадносінаў, дзейснасці законаў.*

*• Увесь корпус суддзяў мусіць быць кампетэнтным, карыстацца поўным даверам грамадзян.*

*• Прысуд павінен быць матываваным, абгрунтаваным, законным і справядлівым.*

*• Стварэнне прававой сістэмы, здольнай забяспечыць функцыянаванне прававой дзяржавы.*

### Праблемы

• поўная залежнасць судоў і суддзяў ад прэзідэнта і яго структур;

• абвінаваўчая і палітычная накіраванасць у дзейнасці суддзяў;

• непрафесіяналізм і прадузятасць суддзяў пры разглядзе спраў;

• немагчымасць абароны правоў падазраваных / абвінавачаных у крымінальным і адміністрацыйным судаводстве;

• прынцып спаборнасці не стаў рэальнасцю ў судовым разглядзе;

• няўдзел у ажыццяўленні правасуддзя прадстаўнікоў ад грамадзян-

скай супольнасці (у тым ліку ў форме прысяжных засядацеляў);

• адмовы судоў у разглядзе скаргаў на рашэнні і дзеянні органаў кіравання і службовых асоб, якія парушаюць правы і свабоды грамадзян;

• абмежаваныя магчымасці адпраўлення правасуддзя на беларускай мове, бо не ўсе суддзі валодаюць беларускай мовай, адсутнічае поўны корпус нарматыўна-прававых актаў на беларускай мове.

## Стратэгічныя кірункі вырашэння

• Самастойнасць і незалежнасць сістэмы судоў замацоўваецца праз абранне суддзяў на нацыянальным узроўні парламентам, на мясцовым – мясцовымі прадстаўнічымі органамі па рэкамендацыі Усебеларускай рады суддзяў з ліку кандыдатаў, якія здалі кваліфікацыйны экзамен, пад час якога адбываецца праверка дзейнасці кандыдата за мінулы перыяд.

Судовая рэформа павінна карэнным чынам змяніць прававы статус суддзяў, умацаваць іх незалежнасць, забяспечыць нязменнасць і недатыкальнасць, годнае матэрыяльна-бытавое і сацыяльнае становішча.

• Правядзенне канстытуцыйнай рэформы, якая забяспечыць выкананне прынцыпу «вяршэнства закона».

• Судовая сістэма складаецца з незалежных дзяржаўных органаў - судоў, закліканых ад імя дзяржавы ажыццяўляць правасуддзе, вырашаць ў судовых установах прававыя спрэчкі і канфлікты.

У паняцце судовай улады ўваходзіць таксама сукупнасць тых адказных ўладных паўнамоцтваў, якімі надзелены суд у мэтах аднаўлення парушанага права і справядлівасці, прымянення мер дзяржаўнага прымусу да асоб, якія замахваюцца на абароненыя законам інтарэсы, у тым ліку і мер крымінальнага пакарання да злачынцаў.

• Скасаванне інстытута народных засядацеляў і ўвядзенне суда прысяжных як найбольш дэмакратычнай формы адпраўлення правасуддзя, выпрацаванай цывілізацыяй і якая забяспечвае незалежнасць і самастойнасць суда, вызначаецца неабходнасцю пашырэння рэальнага ўдзелу насельніцтва ў судовай дзейнасці, прыўнясення ў яе жыццёвага здаровага сэнсу і народнага вопыту, міласэрнасці і справядлівасці.

Суд прысяжных мусіць зрабіцца важнай гарантыяй абароны правоў асоб, якіх органы следства і пракуратуры абвінавачвалі ў цяжкіх злачынствах, але якія не лічаць сябе вінаватымі.

• Судовая ўлада ажыццяўляецца толькі судом.

## Першакрокавыя меры

• Утварэнне аўтаномнай і самакіравальнай Усебеларускай рады суддзяў.

• Замацаванне ў Канстытуцыі прынцыпу выбарнасці суддзяў на нацыянальным узроўні парламентам, на мясцовым – мясцовымі прадстаўнічымі органамі.

• Падрыхтоўка і прыняцце Канцэпцыі судова-прававой рэформы і ў яе развіццё Закона аб судаўладкаванні Рэспублікі Беларусь. У гэтым нарматыўна-прававым акце варта было б вызначыць задачы суда і яго месца ў сістэме дзяржавы і грамадзянскай супольнасці, узаемаадносіны органаў судовай улады з органамі заканадаўчай і выканаўчай уладаў, а таксама паказаць, якія суды ўваходзяць у судовую сістэму дзяржавы, размежаваўшы іх кампетэнцыю. Судова-прававую рэформу варта разглядаць як неад’емную складовую частку агульных рэформаў органаў дзяржаўнай улады і кіравання.

• Для падвышэння якасці адпраўлення правасуддзя, павышэнню яго якасці, даступнасці, забеспячэнню своечасовай і кампетэнтнай абароны канстытуцыйных правоў і свабодаў чалавека прадугледжваецца стварэнне спецыялізаваных судоў на ўзроўні ніжэйшых судоў агульнай юрысдыкцыі і адпаведных судовых калегій на ўзроўні вышэйстаячых судоў, стварэнне апеляцыйных судоў у якасці судоў другой інстанцыі.

• Увядзенне суда прысяжных.

• Стварэнне поўнага корпусу нарматыўна-прававых актаў на беларускай мове.

• Пашырэнне практыкі вынясення прысудаў, не звязаных з пазбаўленнем волі, асабліва па эканамічных злачынствах.

## Вынікі

• Незалежная судовая сістэма, вольная ад палітычнага ціску з боку выканаўчай або заканадаўчай улады. Яна з’яўляецца самастойнай, незалежнай і кампетэнтнай, карыстаецца поўным даверам грамадзян.

• Судовая ўлада – гарант правоў і свабодаў грамадзян і іншых удзельнікаў праваадносін, дзейснасці законаў.

# Войска пад грамадскім кантролем

## і з апорай на беларускую гісторыю

*• Беларусі патрэбна сучасная і гнуткая сістэма нацыянальнай бяспекі, якая будзе здольная хутка адаптавацца да любых змен у краіне і рэгіёне і эфектыўна супрацьстаяць новым выклікам. Сумяшчэнне прынцыпаў прызыўной і кантрактнай формы фармавання войска, аптымізацыя асабовага складу.*

*• Усталяванне грамадскага кантролю над сілавымі структурамі.*

*• Беларусь мусіць зрабіцца сапраўды нейтральнай краінай у ваенным плане, што патрабуе выхаду з вайсковага блоку АДКБ і вываду замежных вайсковых аб'ектаў з тэрыторыі краіны. Імкненне да нейтральнага статусу замацавана ў Канстытуцыі, таму пытанне аб уваходжанні ў вайсковыя блокі мусіць выносіцца на рэферэндум.*

*• Прывядзенне войска да стандартаў НАТА, паглыбленне супрацоўніцтва з праграмай НАТА «Партнёрства дзеля міру», дасягненне поўнай сумяшчальнасці Узброеных сіл Беларусі з адпаведнымі сіламі краін-членаў НАТА.*

*• Патрыятычнае выхаванне вайскоўцаў з апорай на ўласную гісторыю (Полацкае княства, Вялікае княства Літоўскае і г. п.), а не на расійскія і савецкія ўзоры.*

*• Стварэнне добраахвотніцкай вайсковай арганізацыі. Падтрымка скаўцкага руху як часткі сістэмы патрыятычнага выхавання і падрыхтоўкі для службы ў войску.*

## Праблемы

• Напружанне ў рэгіёне Усходняй Еўропы ўзрасло да даўно нябачанага ўзроўню. Дзве суседнія з Беларуссю краіны фактычна знаходзяцца ў стане вайны. Пры такіх умовах і агрэсіўнай палітыцы Расійскай Федэрацыі складана прадказваць далейшае развіццё падзей нават у кароткатэрміновай перспектыве. Усе ранейшыя гаранты бяспекі ў рэгіёне практычна страцілі сваю моц. Адпаведна, ад Беларусі патрабуецца хутка рэагаваць на любыя пагрозы, якія ўзнікаюць ва ўсіх сферах нацыянальнай бяспекі.

• Цяперашняя беларуская армія мае надзвычай дрэнны імідж у грамадстве, выклікаючы асацыяцыі з найгоршымі з’явамі, якія мелі месца ў савецкім войску -- пазастатутнымі адносінамі (г.зв. «дзедаўшчынай»), карупцыяй.

• Ідэалогія беларускіх сілавых структур, якая базуецца на савецкай спадчыне, не адпавядае патрэбам часу. Савецкія назвы беларускіх вайсковых падраздзяленняў і выкарыстанне савецкай сімволікі робяць беларускае войска часткай расійскага ў вачах замежных краінаў, у тым ліку і Расіі.

## Стратэгічныя кірункі вырашэння

**1. Пазаблокавы статус.** Выхад з АДКБ, з Саюзнай дзяржавы, скасаванне рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі, вывад замежных вайсковых аб’ектаў з тэрыторыі краіны (43 вузла сувязі ВМФ Расіі “Вілейка” (радыёстанцыя “Антэй”) у Мінскай вобласці і радыёлакацыйнай станцыі “Волга” дэцыметровага дыяпазону (вузел “Баранавічы”) у складзе расійскай сістэмы папярэджання аб ракетным нападзе, размешчанай каля Ганцавічаў).

**2. Усталяванне грамадскага кантролю над сілавымі структурамі.**

• Прызначэнне на пасады міністраў, адказных за сілавы блок, цывільных, а не ваенных.

• Напаўненне рэальным зместам працы адпаведнай парламенцкай камісіі, каб яна займалася кантролем над сілавымі структурамі, вырашала пытанні іх рэформаў. Для кантролю дзейнасці міністэрстваў парламенцкая камісія мусіць правяраць і ўхваляць змены ці крытычныя рашэнні, якія прымаюцца дадзенымі міністэрствамі – напрыклад, закупка новых узбраенняў або ўдзел у вучэннях за мяжой краіны.

• НДА, якія займаюцца працай з ваеннаслужачымі і іх роднымі, мусяць мець непасрэдны кантакт з вышэйзгадай камісіяй і могуць быць у ёй прадстаўленыя. Яны ж адказваюць за зваротную сувязь ваенных з насельніцтвам.

**3. Прывядзенне войска да стандартаў НАТА.**

• Павелічэнне вайсковага бюджэту да 2% ад ВУП (на дадзены момант Беларусь выдаткоўвае менш за 1% ад ВУП). 2% – гэта ўзровень, які ў краін-членаў НАТА лічыцца мінімальным аб'ёмам фінансавання для падтрымкі баяздольнасці войска на дастатковым узроўні.

• Супрацоўніцтва з НАТА ў плане падрыхтоўкі вайскоўцаў – партнёрства ў адукацыйным плане (навучанне беларускіх вайскоўцаў у замежных ваенных установах адукацыі).

• Супрацоўніцтва з НАТА ў галіне вайсковых тэхналогіяў з мэтай развіцця ўласнага ваенна-прамысловага комплексу.

**4. Патрыятычнае выхаванне вайскоўцаў з апорай на ўласную гісторыю, а не на расійскія і савецкія ўзоры.**

• Сыход ад савецкай сімволікі ва ўсіх сілавых структурах і вайсковых падраздзяленняў. Распрацоўка новай сімволікі на падставе вайсковай геральдыкі іншых перыядаў гісторыі Беларусі – Полацкага княства, ВКЛ, Рэчы Паспалітай, БНР.

• Паступовае ўвядзенне беларускай мовы ў войску для агульнага карыстання.

**5. Стварэнне нацыянальнага цэнтра інфармацыйнай і кібербяспекі**, які будзе займацца ўсімі пытаннямі, звязанымі як з абаронай крытычнай інфраструктуры краіны ад кібератак, гэтак і гарантаваннем бяспекі інфармацыйнай прасторы краіны ад знешніх пагрозаў і магчымага пранікнення туды меседжаў, што ў любой форме нясуць пагрозу нацыянальнай бяспецы Беларусі (ад фэйкавых навінаў да правакацыйных інфармацыйных укідаў і правакавання расколу грамадства).

**6. Аптымізацыя асабовага складу сілавых структураў.**

• Разатэстацыя часткі асабовага складу сілавых структураў. Цывільныя спецыяльнасці ў сілавых структурах мусяць займаць цывільныя спецыялісты, а не людзі ў пагонах.

• Структура асабовага складу сілавых структураў павінна адпавядаць актуальным задачам, а не быць непахісным маналітам.

**7. Вайсковая падрыхтоўка па-за межамі Ўзброеных сіл.**

• Стварэнне Ўсебеларускай добраахвотніцкай вайсковай арганізацыі. Гэтакія ўтварэнні дазваляюць людзям, якія цікавяцца вайсковай справай, быць уцягнутымі ў дзейнасць Узброеных Сілаў краіны і падтрымліваць уласную баявую падрыхтоўку на прымальным узроўні ў сучасных умовах.

• Падтрымка скаўцкага руху, як часткі сістэмы патрыятычнага выхавання і падрыхтоўкі для службы ў войску.

**8. Знішчэнне пазастатутных адносін у войску.** Пры высокай інтэнсіўнасці баявой падрыхтоўкі пазастатутныя адносіны практычна не ўзнікаюць. А стварэнне добраахвотніцкіх арганізацый і адпаведная падрыхтоўка рэзервістаў значна змяншаюць магчымасць іх узнікнення – у лакальнай супольнасці ў межах раёна практычна немагчымая «дзедаўшчына» з прычыны цесных сацыяльных сувязяў.

**9. Развіццё ўласнага ваенна-прамысловага комплексу.** Ваенна-прамысловы комплекс Беларусі ў шэрагу сфераў знаходзіцца сярод сусветных лідараў (напрыклад, вытворчасць колавых шасі альбо сродкаў радыёэлектроннай барацьбы). Гэтыя пазіцыі патрэбна захаваць, а таксама развіваць уласны ВПК, што з'яўляецца адным з фактараў захавання суверэнітэту.

• Захаванне ў дзяржаўнай уласнасці найбольш паспяховых і буйных прадпрыемстваў ВПК з мэтай недапушчэння іх мэтанакіраванага разбурэння і вывазу тэхналогій за мяжу.

• Праграма ільготаў для прыватных прадпрыемстваў ВПК, асабліва тых, чыя прадукцыя карыстаецца попытам на замежных рынках.

• Далейшае развіццё ракетнай і касмічнай праграм, стварэнне шэрагу айчынных ракетных узбраенняў для ўсіх патрэбаў.

• Дзяржаўная падтрымка для навуковых даследаванняў, вынікі якіх у перспектыве могуць быць выкарыстанымі ў ваеннай прамысловасці.

## Першакрокавыя меры

• Дапрацоўка Вайсковай дактрыны Беларусі з улікам сучасных выклікаў бяспекі ў рэгіёне Ўсходняй Еўропы і імкнення краіны зрабіцца сапраўды нейтральнай краінай у ваенным плане.

• Распрацоўка канцэпцыі патрыятычнага выхавання вайскоўцаў з апорай на ўласную гісторыю, пазбаўленую наслаенняў савецкай прапаганды.

• Прынцыповае расследаванне з удзелам прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці ўсіх сігналаў пра пазастатутныя адносіны і карупцыю ва Ўзброеных сілах Беларусі.

## Вынікі

Нейтральная Беларусь атрымае сучасную сістэма нацыянальнай бяспекі, якая будзе эфектыўна супрацьстаяць выклікам. Узброеныя сілы будуць знаходзіцца пад грамадскім кантролем і пазбавяцца ад шырокай практыкі нестатутных адносінаў і карупцыі. Беларускае войска будзе стаяць на абароне сваёй краіны, а не былой метраполіі.

# Шлях Беларусі да еўраатлантычнай супольнасці

*• Стратэгічнай мэтай знешняй палітыкі Беларусі з’яўляецца ператварэнне яе ў рэальнага суб’екта міжнародных адносін.*

*• Падтрымліваем канстытуцыйны прынцып захавання тэрыторыі Беларусі без’ядзернай зонай і імкненне зрабіць дзяржаву нейтральнай.*

*• Маем на ўвазе, што ідэальным варыянтам для Беларусі з’яўляецца далучэнне да еўраатлантычнай супольнасці праз уступленне ў Раду Еўропы, Еўрапейскі Саюз і НАТА тады, калі для гэтага будуць умовы.*

*• Пры будаўніцтве ўзаемакарыснага супрацоўніцтва з Расіяй Беларусь няўхільна прытрымліваецца прынцыпу безумоўнага захавання суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржаў, адказнага выканання імі сваіх міжнародных абавязкаў.*

*• Адносіны з усімі міжнароднымі арганізацыямі і краінамі свету мусяць будавацца выключна на падставах мэтазгоднасці і адпаведнасці нацыянальным інтарэсам.*

## Праблемы

Нягледзячы на пастаянна дэкларованую сённяшнімі ўладамі «шматвек-

тарнасць» знешняй палітыкі Беларусі, цягам чвэрці стагоддзя яна застаецца аднaзначна арыентаванай на Ўсход, галоўным чынам на Расійскую Федэрацыю.

Узнікла крытычная залежнасць, якая дае Маскве магчымасць аказваць вельмі моцны ўплыў на паводзіны беларускага кіраўніцтва на міжнароднай арэне. Больш за тое, цяпер у выніку відавочнага пераходу Крамля да агрэсіўнай палітыкі, патэнцыяльная пагроза незалежнасці нашай дзяржавы ператварылася ў рэальную.

З улікам выхаваных шматгадовай савецкай, а потым і беларускай афіцыйнай прапагандай антынатаўскіх настрояў пераважнай большасці насельніцтва краіны ад яго можна чакаць нават падтрымкі акупацыі з Усходу.

## Стратэгічныя кірункі вырашэння

**1. Вызначэнне еўраатлантычнай інтэграцыі як курса развіцця дзяржавы:**

• зняцце перашкод на шляху да шырокага ўдзелу ў праграме ЕС «Усходняе партнёрства»;

• падпісанне Пагаднення аб партнёрстве і супрацоўніцтве з ЕС;

• падрыхтоўка Пагаднення аб асацыяцыі і Зоне вольнага гандлю з ЕС;

• паступовая адаптацыя ўнутранага заканадаўства да еўрапейскага;

• аказанне дапамогі бізнесу ў пераходзе на еўрапейскія стандарты і ўваходзе на рынкі ЕС;

• паглыбленне інстытуцыйнага супрацоўніцтва з органамі, фондамі і праграмамі ЕС;

• стварэнне ў ЕС кола сяброў Беларусі для садзейнічання яе ўваходу ў аб’яднаную Еўропу.

**2. Далучэнне да Рады Еўропы.**

**3. Напаўненне рэальным зместам канстытуцыйнага палажэння аб нейтралітэце.**

**4. Умацаванне супрацоўніцтва з НАТА:**

• пашырэнне ўдзелу краіны ў праграме НАТА «Партнёрства дзеля міру»;

• далучэнне беларускіх міратворчых падраздзяленняў да адпаведных аперацый альянсу.

**5. Нармалізацыя стасункаў і максімальнае паглыбленне ўсебаковага ўзаемадзеяння са Злучанымі Штатамі Амерыкі.**

**6. Наданне першачарговай увагі сувязям** з краінамі Балтыйскага і Паўночнаморскага рэгіёнаў, Цэнтральнай Еўропы, а таксама з Вялікабрытаніяй, Францыяй, Італіяй, Канадай, Японіяй, Ізраілем.

**7. Асаблівa шчыльнае супрацоўніцтва з суседнімі краінамі** для зняцця

існуючых супярэчнасцяў і сумеснага вырашэння рэгіянальных задач ва ўсіх галінах.

**8. Пераход ад ідэалагічнага да прагматычнага падыходу ў супрацоўніцтве з краінамі «трэцяга свету».**

**9. Паступовае ўсталяванне стандартных міждзяржаўных адносінаў** з Расійскай Федэрацыяй і іншымі краінамі СНД.

**10. Працяг удзелу ў постсавецкіх аб'яднаннях выключна на ўмовах роўнасці**, абароны нацыянальных інтарэсаў і адсутнасці шкоды для еўрапейскай інтэграцыі.

**11. Наладжванне эфектыўнага супрацоўніцтва з дыяспарай.**

**12. Рэформа Міністэрства замежных спраў:**

- прывядзенне структуры міністэрства ў адпаведнасць са зменай геапалітычнай арыентацыі без ажыццяўлення люстрацыі;
- скарачэнне гандлёвага складніка яго дзейнасці.

## Першакрокавыя меры

- Вызначэнне месца і ролі Беларусі ў сістэме сучасных міжнародных адносінаў.
- Распрацоўка новай канцэпцыі знешняй палітыкі краіны, рэформа Міністэрства замежных спраў.
- Вызначэнне нацыянальнай бяспекі як галоўнага прыярытэту знешняй палітыкі Беларусі.

## Вынікі

Беларусь напоўніла рэальным зместам канстытуцыйнае палажэнне аб нейтралітэце, уступіла ў Раду Еўропы, вызначыла курс на далучэнне да еўраатлантычнай супольнасці праз уступленне ў Еўрапейскі Саюз і НАТА.

Беларусь з'яўляецца рэальным суб'ектам міжнародных адносін, займае актыўную і канструктыўную пазіцыю ў міжнародных арганізацыях. Шляхам шматбаковай дыпламатыі Беларусь забяспечвае свае нацыянальныя інтарэсы ў абароне суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці, стварае спрыяльныя умовы для эканамічнага і культурнага развіцця.

# Ад перажыткаў каманднай эканомікі да вольнага рынка

*• Лібералізацыя ўсіх рынкаў і пабудова ў Беларусі інстытутаў адкрытай рынкавай эканомікі як элементаў самарэгулявання.*

*• Дзяржава мусіць устанаўліваць і потым падтрымліваць правілы гульні для суб’ектаў гаспадарання, а не канкурыраваць з імі.*

*• Аднаўленне права прыватнай уласнасці на зямлю ў поўным аб’ёме.*

## Праблемы

• манаполія дзяржавы практычна ва ўсіх сферах гаспадарчай дзейнасці і захаванне перажыткаў савецкай каманднa-планавай мадэлі кіравання эканомікай;

• штучнае вылучэнне дзяржаўнага сектара эканомікі з рыначных умоў гаспадарання, што адбываецца насуперак канстытуцыйнаму прынцыпу роўнасці ўсіх форм уласнасці;

• празмерны падаткавы цяжар з адначасова ўскладненай сістэмай уліку і адміністравання падаткаў;

• адсутнасць рынкавай інфраструктуры і элементаў самарэгулявання эканомікі.

## Стратэгічныя кірункі вырашэння

• Эканамічныя рэформы патрабуюць лібералізацыі ўсіх рынкаў і пабудовы інстытутаў адкрытай рынкавай эканомікі як элементаў самарэгулявання эканомікі (прыватныя прадпрыемствы, біржы, інвестыцыйныя фонды, сістэма сацыяльнага і медыцынскага страхавання і г.д.).

• Перамяшчэнне прыняцця гаспадарчых рашэнняў ад дзяржаўных органаў да суб’ектаў гаспадарання, ад перажыткаў каманднай эканомікі да вольнага рынка, стварэнне для бізнесу стабільнага і бяспечнага прававога і гаспадарчага асяроддзя.

• Роля дзяржавы зводзіцца да ўстаноўкі і далейшага падтрымання правіл гульні для суб’ектаў гаспадарання, а таксама прадухілення негатыўных наступстваў для экалогіі, сацыяльнай абароны насельніцтва.

• Правядзенне канстытуцыйнай рэформы, якая забяспечыць выкананне прынцыпу «вяршэнства закона», а таксама роўнасці суб’ектаў гаспадарання ў незалежнасці ад формы ўласнасці.

• Аднаўленне права прыватнай уласнасці на зямлю ў поўным аб’ёме.

• Трансфармацыя сістэмы сацыяльнага забеспячэння ў сістэму сацыяльнага страхавання.

• Максімальная рацыяналізацыя выкарыстання матэрыяльных, працоўных і фінансавых рэсурсаў Беларусі за кошт развіцця канкурэнцыі.

## Першакрокавыя меры

• замацаванне рэальнай незалежнасці Нацыянальнага банка і правядзенне ім адказнай манетарнай палітыкі;

• спрашчэнне падаткавай сістэмы, імкненне да адназначнасці нарматыўна-метадычных палажэнняў Падаткавага кодэксу, пашырэння магчымасці прымянення льготы па прыбытку, што накіроўваецца на капітальныя ўкладанні (прыбытак будзе вызваляцца ад падаткаабкладання па факце ажыццяўлення інвестыцый без увязкі з выкарыстаннем амартызацыйнага фонду). Наблізіць падатковую сістэму па складу падаткаў і збораў, перыядычнасці іх выплаты да падатковых сістэм развітых краін;

• падтрыманне нізкага ўзроўню інфляцыі і паніжэнне стаўкі рэфінансавання да ўзроўню, які б зрабіў даступным айчынныя крэдыты беларускім суб’ектам гаспадарання;

• забеспячэнне роўнага доступу усіх суб’ектаў гаспадарання да ўдзелу ў тэндарах на дзяржаўныя закупкі і аказанні паслуг у межах дзяржаўнай замовы;

• абмежаванне сферай натуральных манаполій кола відаў дзейнасці,

якія ліцэнзуюцца;

• аднавіць і развіць інстытуцыянальныя элементы рынкавай інфраструктуры: таварныя і фондавыя біржы, брокерскія канторы, сістэма сацыяльнага і медыцынскага страхавання і г.п.;

• спрасціць уваходжанне ў бізнес, вядзенне і спыненне гаспадарчай дзейнасці;

• пашырыць практыку вызвалення суб’ектаў гаспадарання ад адміністрацыйнай адказнасці ў выпадку нязначнасці ўчыненых парушэнняў, прыняцця мер па іх устраненню і кампенсацыі прычыненай шкоды;

• правесці разавую амністыю даходаў усіх юрыдычных і фізічных асобаў;

• стварыць вольны рынак зямлі і працоўнай сілы;

• прыняць закон «Аб іпатэцы і крэдытах», які б прадугледжваў залог нерухомасці, у тым ліку зямлі, і прымусовага іх адчужэння;

• прыняць заканадаўства, якое б скарачала тэрміны і падвышала эфектыўнасць працэдур банкруцтва. Інстытут банкруцтва мусіць зрабіцца рэгулятарам эканомікі. Дзяржава мусіць прымаць рашэнне па санацыі прадпрыемстваў-даўжнікоў толькі пры наяўнасці абгрунтаваных бізнес-планаў;

• прывесці да ладу нерэнтабельных прадпрыемстваў з наступным адкрытым продажам іх акцый на аўкцыёнах, што дазволіць жыхарам Беларусі інвеставаць свае ашчаджэнні на фондавай біржы;

• правесці лібералізацыю ўмоў вядзення бізнесу, павялічыць удзельную долю мікра-, малога і сярэдняга бізнесу ў эканоміцы Беларусі ў ВУП Беларусі да 60%;

• трансфармаваць сістэму сацыяльнага забеспячэння ў сістэму сацыяльнага страхавання;

• правесці паслядоўны пераход да адраснай сацыяльнай абароны праз сістэму сацыяльнага страхавання. Адмовіцца ад сістэмы перакрыжаванага субсідыявання насельніцтва за кошт завышаных тарыфаў на энерганосьбіты для суб’ектаў гаспадарання. Вызваліць прадпрыемствы ад выканання сацыяльных функцый;

• забяспечыць інтэграцыю ў сусветную эканоміку, уступленне ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, атрыманне тэхнічнай і крэдытнай падтрымкі ад сусветнай супольнасці;

• эканамічную рэформу варта разглядаць як неад’емную складовую частку агульных рэформаў органаў дзяржаўнай улады і кіравання.

## Вынікі

• Сфармаваная адкрытая рынкавая эканоміка і Беларусь будзе ўключана ў працэс глабалізацыі.

• Створаная сістэма гарантый прыватнай уласнасці, стабільнае і бяспечнае прававое і гаспадарчае асяроддзе для бізнесу.

• Беларусь мае прывабнае для інвестыцый асяроддзе з высокай ступенню эканамічнай свабоды.

• Беларускія наёмныя работнікі атрымалі новыя высокатэхналагічныя працоўныя месцы.

• Жыхары Беларусі атрымалі сістэму, якая гарантуе эфектыўную адрасную сацыяльную абарону.

# Якасная медыцына
## з чалавечым абліччам

*• Паляпшэнне фінансавання медыцынскай галіны праз прыцягненне дадатковых сродкаў у сістэму і аптымізацыі выдаткаў унутры яе, а ў перспектыве давядзення яе фінансавання мінімум да сярэднееўрапейскага паказчыка (7% ВУП).*

*• Павелічэнне адкрытасці сістэмы аховы здароўя праз далучэнне шырокай грамадскасці , пацыентаў і прафесійнай супольнасці да вырашэння актуальных праблем аховы здароўя.*

*• Дакладна акрэслены план па пераходзе аховы здароўя Беларусі да страхавой мадэлі, якая з’яўляецца аптымальнай для эфектыўнага супрацьдзеяння сучасным выклікам грамадскага здароўя.*

*• Адаптацыя еўрапейскіх пратаколаў і стандартаў лячэння і прафілактыкі захворванняў, заснаваных на прынцыпах доказнай медыцыны.*

*• Крытычны перагляд функцыянальных абавязкаў медработнікаў – максімальнае скарачэнне непатрэбнага дакументазвароту, зняцце няпрофільных абавязкаў.*

## Праблемы

**1. Недафінансаванне аховы здароўя**

Беларусь на працягу апошніх 10 год скіроўвае на фінансаванне аховы здароўя каля 4% ад валавага ўнутранага прадукту. Гэта істотна менш, чым

у сярэднім на ЕС (каля 7%). Калі паглядзець на памеры гэтых выдаткаў ў абсалютным выражэнні (international USD), то розніца нават з бліжэйшымі краінамі ЕС складзе 1,5-2,5 разы.

**2. Дысбаланс структуры сістэмы на карысць стацыянарнага звяна ахо-вы здароўя**

Ад савецкай сістэмы Беларусі дасталася савецкая сістэма аховы здароўя (т.зв. сістэма Сямашкі), якая характарызавалася вялікай колькасцю шпіталёў, прызначаных для хуткай ізаляцыі і лячэння вялікай колькасці пацыентаў з інфекцыйнымі хваробамі, якія былі найбольш актуальнымі у гады стварэння гэтай сістэмы.

Сучасная Беларусь захавала сістэму Сямашкі з невялікімі зменамі, нягледзячы на тое, што цяпер дамінуюць неінфекцыйныя захворванні, якія патрабуюць не хуткай шпіталізацыі, а працяглага лячэння ў амбулаторных умовах (паліклініцы, медцэнтры, прыватным кабінеце доктара).

**3. Перагружанасць паліклінічнага звяна і звышдаступнасць «Хуткай дапамогі»**

Жыхары Беларусі з’яўляюцца чэмпіёнамі еўрапейскага рэгіёну па колькасці наведвання паліклінік – каля 13 раз на кожнага чалавека, што істотна часцей суседзяў (6,9 у Літве, 6,8 у Польшчы, 10,7 ва Украіне). Істотная частка гэтых візітаў мае чыста нарматыўную прыроду і звязана з абавязковымі праграмамі медаглядаў ці неабходнасцю праз тры дні з’явіцца на прыём па закрыцці ці прыцягненні «бальнічнага» ці афармленні рэцэпта. У выніку ў паліклініках назіраюцца чэргі.

Праблемы даступнасці паліклінік у пэўным сэнсе кампенсуе служба «Хуткай дапамогі», якая па меркаваннях экспертаў з’яўляецца звышдаступнай. Беларусы нашмат часцей за суседзяў звяртаюцца ў гэтую службу, пры тым што па розных ацэнках ад 10 да 70% зваротаў з’яўляюцца неабгрунтаванымі і гэтыя праблемы са здароўем маглі бы быць эфектыўна вырашаныя ў паліклініцы. Між тым сярэдні кошт выкліку хуткай дапамогі ў Мінску складае 65 рублёў, а візіту да лекара ў паліклініку толькі 13.

**4. Недасканалы механізм фінансавання галіны.**

Фінансаванне аховы здароўя ў Беларусі адбываецца з дзяржаўнага бюджэту – мясцовага і агульнанацыянальнага. Абавязковае медыцынскае страхаванне адсутнічае, а добраахвотнае не развітае і адыгрывае мізэрную ролю ў гэтым працэсе (менш за 1%). Каля 26-28% выдаткаў на ахову здароўя пакрываюцца з асабістых сродкаў грамадзян (у асноўным гэта выдаткі на лекі).

**5. Кадравая праблема**

У беларускай сістэме аховы здароўя назіраецца т.зв. “кадравы пара-

докс”, калі пры колькасці практыкуючых дактароў на 100000 насельніцтва Беларусь пераўзыходзіць не толькі Польшчу і Літву з Латвіяй, але і Швецыю з Нямеччынай. Пры гэтым назіраецца заўважны дэфіцыт лекараў у першасным звяне аказання медыцынскай дапамогі.

Праца ў сегменце ПМСД лічыцца не прэстыжнай і лекары імкнуцца пры першай магчымасці хутчэй перайсці ў стацыянар. Найбольш гэты недахоп назіраецца ў рэгіёнах (асабліва тых, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай аварыі).

Прынятыя спосабы вырашэння кадравай праблемы ў Беларусі (абавязковае размеркаванне і павышаны набор у медыцынскія ВНУ) эфекту не даюць. Моцным дэматывуючым фактарам для медработнікаў з’яўляюцца традыцыйна нізкія заробкі ў сістэме (на 25-30% менш, чым у прамысловасці) і фармальнасць сістэмы матэрыяльнай матывацыі за добрую працу. У адказ на гэтыя працэсы павялічваецца міграцыя спецыялістаў у краіны замежжа.

**6. Непразрыстаць працы сістэмы аховы здароўя**

У 2018 годзе Следчы камітэт Беларусі ўзбудзіў крымінальную справу па фактах карупцыі пры ажыццяўленні дзяржаўных закупак ў Міністэрстве аховы здароўя. Гэты факт разам з нядаўнім скандалам з карэйскай вакцынай, якая ўжывалася на тэрыторыі краіны без дзяржаўнай рэгістрацыі, прадэманстраваў, што чыноўнікі ведамства схільныя да “шэрых схем” пры ажыццяўленні сваёй дзейнасці.

## Стратэгічныя кірункі вырашэння

• Паляпшэнне фінансавання медыцынскай галіны праз прыцягненне дадатковых сродкаў у сістэму і аптымізацыі выдаткаў унутры яе, а ў перспектыве давядзення яе фінансавання мінімум да сярэднееўрапейскага паказчыка (7% ВУП).

• Павышэнне матываванасці медработнікаў да працы праз перагляд сістэмы налічэння заработнай платы.

• Аптымізацыя структуры і функцыянавання сістэмы аховы здароўя адпаведна сучасным выклікам грамадскага здароўя.

• Павелічэнне адкрытасці сістэмы аховы здароўя праз далучэнне шырокай грамадскасці, пацыентаў і прафесійнай супольнасці да вырашэння актуальных праблем аховы здароўя.

• Дакладна акрэслены план па пераходзе аховы здароўя Беларусі да страхавой мадэлі, якая з’яўляецца аптымальнай для эфектыўнага супрацьдзеяння сучасным выклікам грамадскага здароўя.

## Першакрокавыя меры

**На першым этапе рэформы трэба правесці лібералізацыю медыцынскага рынку**, істотна спрасціць і палепшыць ўмовы для вядзення медыцынскага прыватнага бізнесу, ўстанавіць сапраўды роўныя правы для прыватных і дзяржаўных устаноў аховы здароўя.

Праведзеныя мерапрыемствы дазволяць лекарам ствараць свае кабінеты, далучацца да новастворанах медыцынскіх цэнтраў і свабодна канкураваць на рынку паслуг. Гэта дасць магчымасць самастойна зарабляць, павысіць іх матывацыю да працы без неабходнасці неадкладна падымаць заробак у дзяржаўнай сістэме.

Такім чынам, зменшыцца ціск на дзяржаўныя паліклінікі (па дадзеных апытанняў жыхароў Мінску каля 30% ужо цяпер выбіраюць прыватныя ўстановы аховы здароўя) і павысіцца якасць медыцынскага абслугоўвання. Адначасова трэба прадугледзіць механізм кампенсацыі выдаткаў грамадзян, якія яны скіроўваюць на сваё лячэнне праз вяртанне падаткаў.

**Радыкальна спрасціць умовы інвеставання ў стварэнне новых лячэбных установаў**. У Беларусі павінны працаваць не толькі прыватныя медцэнтры, але і шпіталі, рэабілітацыйныя цэнтры, санаторыі і г.д. Кваліфікацыя беларускіх медыкаў, цяперашні ўзровень медыцынскага інфраструктуры, беларуская прырода і культура дазваляе зрабіць медыцынскі турызм адной з асноўных крыніц паступлення ў бюджэт краіны.

**Поўнавартасная рэалізацыя прынцыпу фінансавання галіны «грошы ідуць за пацыентам».**

**Спрыянне актыўнаму ўдзел беларускіх медыкаў у міжнародных даследчыцкіх і клінічных праграмах**, і праз гэта прыцягненне дадатковага фінансавання медыцынскай навукі і практыкі.

**Развіццё супрацоўніцтва з недзяржаўнымі арганізацыямі** ў галіне прафілактычных і адукацыйных праграм па здаровым ладзе жыцця, навучанні насельніцтва першай дапамозе і г.д. Прыцягненне міжнародных сродкаў для гэтых праграм.

**Змены ў функцыянаванні сістэмы аховы здароўя:**

• адаптацыя еўрапейскіх пратаколаў і стандартаў лячэння і прафілактыкі захворванняў, заснаваных на прынцыпах доказнай медыцыны;

• канкрэтызаваць пералік медыцынскіх паслуг, якія ўваходзяць у склад мінімальных сацыяльных стандартаў і гарантуюцца дзяржаўнай сістэмай аховы здароўя (зараз гэты спіс уключае практычна ўсе медыцынскія паслугі);

• крытычны перагляд функцыянальных абавязкаў медработнікаў – максімальнае скарачэнне непатрэбнага дакументаабарота, зняцце няпро-

фільных абавязкаў (напрыклад, наведвання медсёстрамі сем’яў якія выхоўваюць дзяцей, прызнанымі ў “сацыяльна небяспечным становішчы)”;

• рацыянальнае развіццё e-Health – віртуальнай прасторы, дзе знаходзіцца медыцынская інфармацыя пра пацыентаў у Беларусі;

• развіццё медыцынскіх камунікацый і кансультацый пацыентаў праз Інтэрнэт;

• крытычная ацэнка праграм дыспансэрызацыі насельніцтва на прадмет іх эфектыўнасці, з улікам сучасных еўрапейскіх рэкамендацый;

• увядзенне ў заканадаўства нормы, паводле якой працадаўца можа прадастаўляць кароткачасовы адпачынак работніку па хваробе без прадстаўлення лістка непрацаздольнасці;

• аптымізацыя выдаткаў у сістэме (маніторынг эфектыўнасці выдаткаў, іх бягучы незалежны аўдыт і аператыўныя змены ў сістэме);

• разгрузка сістэмы «Хуткай дапамогі» праз змены ў рэжыме работы паліклінік (увядзенне дзяжурстваў лекараў паліклінік у вечаровы і начны час, каб пацыенты мелі магчымасць самастойна наведаць доктара), перагляд стандартаў працы службы, адукацыйную работу с насельніцтвам.

**Змены ў структуры сістэмы аховы здароўя праз развіццё розных форм медыцынскага абслугоўвання насельніцтва**, развіццё інстытута лекара агульнай практыкі (сямейнага лекара), паліклінік і амбулаторый, скарачэнне бальнічных коек.

**Паляпшэнне матывацыі медработнікаў:**

• прааналізаваць фінансавыя магчымасці краіны і (калі магчыма) прыняць абавязкі паступовага павышэння заробку ў сістэме аховы здароўя. Бліжэйшы арыенцір – зраўняць сярэдні заробак у сістэме аховы здароўя і прамысловасці. Жорстка прытрымлівацца ўзятых на сябе абавязкаў;

• заахвочванне самаадукацыі і прафесійнага росту работнікаў галіны, стварэнне сістэмы матэрыяльнай матывацыі ад колькасці пацыентаў ды іншых фактараў прафесіяналізму;

• увядзенне сістэмы ліцэнзавання медработнікаў, а не лячэбных установаў, як гэта робіцца цяпер. Стварэнне ўмоваў для развіцця медыцынскага самакіравання.

**Павелічэнне адкрытасці сістэмы аховы здароўя** праз змены прынцыпаў дзейнасці прэс-службы Міністэрства аховы здароўя, увядзенне нормы пра абавязковае прадстаўленне вычарпальнай інфармацыі пра закупкі медпрэпаратаў і медыцынскай тэхнікі па першым патрабаванні, правядзенне ўсебаковага аўдыту дзейнасці міністэрства, ангажаванне пацыентаў і работнікаў сістэмы ў прыняцце рашэнняў у яе межах.

**Далейшыя крокі** – стварэнне плана па пераходу да сістэмы медыцын-

скага страхавання (патрабуе эканамічных рэформ).

## Вынікі

• Беларусь атрымае сістэму аховы здароўя добрага сярэдняеўрапейскага ўзроўню (бліжэйшы арыенцір – Літва, далейшы – Чэхія), інтэграваную ў еўрапейскія працэсы і адаптаваныя да еўрапейскага трэнду і дынамікі развіцця,

• Змяншэнне захворвальнасці і смяротнасці насельніцтва (той, якая можа быць папярэджана медыцынскімі метадамі),

• Павелічэнне працягласці жыцця насельніцтва Беларусі.

• Павышэнне фінансавай эфектыўнасці беларускай сістэмы аховы здароўя,

• Павышэнне міжнароднай рэпутацыі медыцынскай сістэмы Беларусі,

• Павелічэнне задаволенасці насельніцтва працай сістэмы аховы здароўя краіны.

# Новая сістэма адукацыі –
## для еўрапейскай будучыні

*• Сістэма адукацыі павінна рыхтаваць навучэнцаў не да здачы іспытаў, а да жыцця. Выпускнікі мусяць валодаць кампетэнцыямі, якія запатрабаваны на беларускім і на сусветным рынках працы.*

*• Замест абавязковага размеркавання выпускнікоў – дапамога з боку ВНУ сваім выпускнікам знайсці першае месца працы. Выпускнік мае права, але не абавязаны звяртацца па гэтую дапамогу.*

*• ВНУ павінны зрабіцца нацыянальнымі і пры гэтым уключанымі ў Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі (ЕПВА), гэта значыць удзельнічаць у Балонскім працэсе.*

*• Вядучую ролю ў рэфармаванні сістэмы адукацыі мусіць мець не дзяржава, а самі ВНУ праз механізмы акадэмічнага і студэнцкага самакіравання ў адпаведнасці з еўрапейскім прынцыпам універсітэцкай аўтаноміі.*

## Праблемы

• Адукацыя ў Беларусі не гарантуе высокай кваліфікацыі выпускнікоў, іх запатрабаванасць на рынку працы, не адпавядае еўрапейскім стандартам.

• Пры далучэнні да Балонскага працэсу Беларусь узяла на сябе абавязак да 2019 году прыняць Нацыянальную рамку кваліфікацый вышэйшай

адукацыі, якая складаецца з двух ступеняў (бакалаўрыят і магістратура), а таксама правесці іншыя рэформы, сярод якіх наданне рэальнай аўтаноміі ВНУ і адмена прымусовага размеркавання выпускнікоў - гэтыя абавязацельствы не выконваюцца.

• Немагчыма атрымаць вышэйшую адукацыю цалкам на беларускай мове, роўна як штучна ўскладнены выбар беларускай мовы навучання на ўсіх іншых этапах адукацыйнага працэсу.

• Акадэмічная мабільнасць як для навучэнцаў, так і для выкладчыкаў ускладнена бюракратычнымі перашкодамі і нізкім узроўнем валодання замежнымі мовамі.

• Акадэмічныя этыка і свабода сістэмна парушаюцца, асабліва абмяжоўваюцца грамадска-палітычная дзейнасць студэнтаў і выкладчыкаў.

## Стратэгічныя кірункі вырашэння

Беларусь мусіць выканаць узятыя на сябе абавязкі ў межах далучэння да Балонскага працэсу і правесці комплекснае рэфармаванне сістэмы адукацыі ў духу дэсаветызацыі і еўрапеізацыі. Вядучую ролю ў рэфармаванні сістэмы адукацыі мусіць мець не дзяржава, а самі ВНУ праз механізмы акадэмічнага і студэнцкага самакіравання ў адпаведнасці з еўрапейскім прынцыпам універсітэцкай аўтаноміі.

Рэформа мусіць у сябе ўключаць розныя элементы – ад арыентацыі на шчыльнае ўзаемадзеянне з рынкам працы да імплементацыі ў беларускіх ВНУ ідэй, каштоўнасцяў і прынцыпаў, якія ляжаць у аснове еўрапейскай адукацыйнай сістэмы.

**1. Сістэма адукацыі павінна рыхтаваць навучэнцаў не да здачы іспытаў, а да жыцця.** ВНУ мусяць дбаць пра запатрабаванасць кампетэнцый сваіх выпускнікоў на беларускім і сусветным рынках працы.

Для гэтага ВНУ мусяць быць гнуткімі ў фармаванні навучальных праграм, супрацоўнічаць у іх выпрацоўцы з бізнес-асацыяцыямі і прафесійнымі супольнасцямі, павялічыць у навучальным плане долю практыкаарыентаваных заняткаў. У Беларусі мусіць быць сфармаваная Нацыянальная рамка кваліфікацый вышэйшай адукацыі.

**2. Еўрапейскі шлях.** Далучыўшыся да Балонскаму працэсу, Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (ЕПВА), Беларусь афіцыйна зрабіла выбар на карысць еўрапейскай мадэлі развіцця вышэйшай адукацыі і ўзяла на сябе абавязак правесці рэформы ў адпаведнасці з Дарожнай мапай, прадстаўленай еўрапейскімі партнёрамі і ўжо зафіксаванай у беларускім нарматыўна-прававым полі.

У адпаведнасці з еўрапейскімі прынцыпамі неабходна гарантаваць магчымасць атрымання ўсіх узроўняў адукацыі на беларускай мове і сістэмна палепшыць выкладанне замежных моваў у школах і ВНУ.

**3. Замест абавязковага размеркавання выпускнікоў – дапамога з боку ВНУ сваім выпускнікам знайсці першае месца працы.** Выпускнік мае права, але не абавязаны звяртацца па гэтую дапамогу. ВНУ мусяць акумуляваць заяўкі ад працадаўцаў розных формаў уласнасці, якія зацікаўлены прадставіць працоўнае месца выпускніку з улікам працоўных гарантый (статус «маладога спецыяліста»). Адмова ад размеркавання не павінна несці негатыўных наступстваў кшталту выплаты студэнтам кампенсацыі за сваё навучанне на бюджэтнай форме.

**4. Еўрапейскія заробкі для беларускіх выкладчыкаў.** Павелічэнне заробкаў акадэмічных супрацоўнікаў і стварэнне ў беларускіх ВНУ матэрыяльнай базы еўрапейскага ўзроўню павінна суправаджацца інстытуцыянальнымі зменамі ў фінансавай палітыцы ВНУ: замацаваннем прынцыпу фінансавай аўтаноміі пры поўнай адкрытасці ўніверсітэцкага бюджэту і празрыстых прынцыпах размеркавання рэсурсаў.

**5. Адкрытасць свету.** Інтэрнацыяналізацыя вышэйшай адукацыі з'яўляецца яго перавагай у эпоху глабалізацыі. Для дасягнення гэтай мэты неабходна сістэмна палепшыць выкладанне замежных моваў і заахвочваць стажыроўкі і абмены.

Адначасова важна фармаваць інтэрнацыянальнае асяроддзе ў беларускіх ВНУ, якое будзе спрыяць фармаванню ў навучэнцаў будучых прафесійных сувязяў, міжкультурнаму абмену і росту талерантнасці. Неабходна фармаваць механізмы прыцягнення ў Беларусь замежных студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама ствараць умовы для стымулявання выязной акадэмічнай мабільнасці за кошт адпаведных дзяржаўных стыпендыяльных праграм.

## Першакрокавыя меры

1. Міністэрства адукацыі пры ўдзеле профільных бізнес-асацыяцый і прафесійных супольнасцяў мусіць распрацаваць Нацыянальную рамку кваліфікацый, адпаведную Сістэме кваліфікацый ў ЕПВА (QF-EHEA), замест маральна састарэлага Адзінага тарыфна-кваліфікацыйнага даведніка работ і рабочых прафесій.

2. ВНУ мусяць супрацоўнічаць з прадстаўнікамі бізнесу ў арганізацыі навучальнага працэсу: запрашаць іх ва ўніверсітэты для кансультавання ў розных формах і на розных этапах (ад распрацоўкі навучальных планаў да

ўдзелу ў асобных практычных занятках); ўключаць іх прадстаўнікоў у апякунскія рады і іншыя падобныя структуры.

**3. Заснаванне ў ВНУ фондаў мэтавага капіталу (эндаўментаў).** Гэтыя фонды акумулююць сродкі ад уласных платных паслуг і донарскія ахвяраванні (ад прыватных мецэнатаў, карпаратыўных спонсараў, міжнародных фондаў або дзяржаўнага бюджэту) і за іх кошт універсітэты забяспечаць падмурак свайго ўстойлівага развіцця, уключаючы годныя зарплаты выкладчыкаў і стварэнне сучасных матэрыяльных умоў для адукацыйнага працэсу.

**4. Напаўненне рэальным зместам акадэмічнага і студэнцкага самакіравання** ў адпаведнасці з еўрапейскім прынцыпам універсітэцкай аўтаноміі.

**5. Прытрымлівацца прынцыпу акадэмічнай свабоды.** Любыя спробы ціску павінны неадкладна спыняцца адміністрацыяй універсітэта, акадэмічным і студэнцкай супольнасцю і служыць падставай для санкцый у дачыненні да таго, хто дапусціў парушэнне.

**6. Неабходна арганізацыя адукацыйных праграм для выкладчыкаў і прадстаўнікоў студэнцкіх арганізацый** беларускіх ВНУ, якія б былі падрыхтаваныя пры падтрымцы экспертаў з краін ЕПВА і накіраваны на растлумачэнне сутнасці ЕПВА і планаваных у адпаведнасці з Дарожнай мапай зменаў. Такія праграмы павінны ўключаць у сябе кароткатэрміновыя паездкі ва ўніверсітэты краін ЕПВА для абмену вопытам і вывучэння іх прынцыпаў і атмасферы працы.

**7. Істотна палягчаць адміністрацыйныя працэдуры, звязаныя з вяртаннем у Беларусь** пасля атрымання адукацыі за мяжой, у тым ліку аўтаматычнае прызнанне дыпломаў і Настрыфікацыя вучоных ступеняў краін ЕПВА, роўна як і залік пройдзеных за мяжой прадметаў (крэдытаў ECTS) у кошт выканання вучэбнага плана студэнтаў.

**8. Неабходна забяспечыць магчымасць атрыманне адукацыі на беларускай мове** на ўсіх яе этапах. Гуманітарныя прадметы павінны ўтрымліваць беларускі нацыянальны кампанент. Пры гэтым неабходна паважаць правы і іншых нацыянальнасцяў, якія пражываюць у Беларусі і якія аказалі ўплыў на яе гісторыю і культуру.

## Вынікі

• Новая сістэма вышэйшай адукацыі Беларусі рыхтуе высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў, якія валодаюць усімі неабходнымі практычнымі кампетэнцыямі і хутка знаходзяць годнае працу па спецыяльнасці ў Беларусі і за яе межамі.

• Беларускія ўніверсітэты сталі неад’емнай часткай Еўрапейскага прасторы вышэйшай адукацыі, у іх паважаюць акадэмічную свабоду і выконваюць акадэмічную этыку, забяспечваюць магчымасць атрымліваць адукацыю на беларускай мове, а кіруюць імі выбраныя акадэмічнай супольнасцю рэктар, сенат і студэнцкае самакіраванне.

• Выкладчыкі атрымліваюць годную зарплату, а студэнты вучацца ў сучасных матэрыяльных умовах і маюць доступ да самым лепшым вучэбных матэрыялаў. Фінансавая аўтаномія ўніверсітэтаў і іх мэтавы капітал (эндаўмент) дазваляюць усё гэта фінансаваць, а транспарэнтнасць бюджэтаў прадухіляе злоўжыванні.

• Беларускія студэнты валодаюць замежнымі мовамі маюць магчымасць вучыцца па абмене ў еўрапейскіх універсітэтах, а выкладчыкі - праходзіць там стажыроўкі. Студэнты з усяго свету прыязджаюць вучыцца ў Беларусь, падтрымліваючы універсітэты фінансава і ствараючы інтэрнацыянальнае асяроддзе міжкультурнага дыялогу.

Маладыя беларусы, якія скончылі лепшыя замежныя універсітэты пры падтрымцы нацыянальнай стыпендыяльнай праграмы або самастойна, камфортна вяртаюцца ў Беларусь для працы і ўкараняюць міжнародныя навацыі на радзіме.

# Для нататак

# Для нататак

# Для нататак